деления объема информации, которая должна быть изложена в слайдах, чтобы рассматриваемый вопрос по содержанию был раскрыт полностью. Либо работа обучающегося может заключаться в совершенствовании уже имеющейся презентации путем подбора иллюстративного или схематичного сопровождения для текста слайдов.

Презентацию можно использовать и для систематизации пройденного материала по учебной дисциплине при проведении консультации перед экзаменом.

Спектр применения мультимедийных технологий в образовательном процессе постоянно расширяется. Они уже используются для создания обучающих программ, целостной концепции построения образовательных программ в области мультимедиа. Существующие мультимедийные пособия в отличие от традиционных позволяют не только обогатить процесс восприятия информации, но и представить факты, события, процессы во взаимосвязи.

Таким образом, использование мультимедийных технологий в образовательном процессе позволяет перейти от пассивного к активному способу реализации образовательной деятельности. Использование мультимедийных технологий помогает преподавателю в построении процесса обучения, а обучающимся в освоении учебной дисциплины. Данные технологии позволяют достичь более глубокого запоминания материала через образное восприятие, обеспечить погружение в изучаемое при помощи всех каналов восприятия. Закономерности использования мультимедийных технологий в процессе обучения изучает новая отрасль дидактики – дидактика мультимедийного преподавания, которая на сегодняшний день является относительно новой и мало изученной, но не отрицается ее использование в высшей школе.

УДК 34 + 808.26

***В.К. Мароз****, прафесар кафедры беларускай і замежных моў Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, доктар філалагічных навук, дацэнт;*
***П.А. Капіца****, курсант следча-экспертнага факультэта Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*

## ВЫПРАЦОЎКА МОЎНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ЮРЫДЫЧНАГА ПРОФІЛЮ

На кафедры беларускай і замежных моў Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь распрацоўваецца методыка комплекснага аналізу моўных з’яў з мэтай укаранення атрыманых ведаў у прафесійна-вучэбную дзейнасць.

Рэалізацыя адукацыйнай праграмы па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» скіравана на тое, каб выпускнік Акадэміі валодаў прафесійнымі кампетэнцыямі па такіх відах дзейнасці: 1) навукова-даследчай, 2) камунікатыўна-справавой, 3) арганізацыйна-кіраўнічай, 4) інавацыйнай.

Падрыхтоўка спецыялістаў юрыдычнага профілю прадугледжвае стварэнне арганізацыйна-метадычных умоў, скіраваных на ўдасканаленне моўных кампетэнцый. У аспекце фарміравання прафесійнага майстэрства і творчасці ставіцца мэта замацавання практычных уменняў і навыкаў кваліфікаванага карыстання вуснай і пісьмовай мовай, пашырэння і ўзбагачэння прафесійнага лексічнага запасу, выпрацоўкі практыкі кваліфікаванага ўжывання беларускай тэрміналогіі, а таксама прафесійнай лексікі па абранай спецыяльнасці. Дасягненне мэты патрабуе вырашэння такіх задач, як фарміраванне ўстаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых ведаў у прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці, выхаванне любві і павагі да мовы як духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа. Для іх рэалізацыі ў межах праграмных тэм выкарыстоўваюцца як традыцыйныя, так і інавацыйныя метады, методыкі і тэхналогіі.

Фарміраванне патрэбы авалодання і карыстання беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці магчыма толькі на аснове трывалых ведаў пра лексічны склад беларускай мовы, яе тэрмінасістэму. Маўленчая культура, у сваю чаргу, садзейнічае падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных не толькі вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму, але праз беларускую мову як крыніцу інфармацыі мэтанакіравана развіваць сацыяльна-асобасныя і сацыяльна-прафесійныя кампетэнцыі навучэнца Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь.

У працэсе авалодання прафесійнай лексікай важным з’яўляецца ўменне даваць характарыстыку такім з’явам, як асаблівасці ўжывання і ўтварэння самастойных часцін мовы, выкарыстання іх у нарматыўным значэнні ў межах тэрміналагічных устойлівых выразаў. Засяродзім увагу на тэрміналагічным аспекце ўжывання прыметніка *працоўны*. Ён мае тры родавыя формы (*працоўны, -ая, -ае*), выступае мнагазначным словам. У першым значэнні ‘які мае адносіны да працы, звязаны з працай’ (*працоўныя навыкі, працоўны стаж, працоўная кніжка*) рэалізуецца шэраг семантычных адценняў: ‘заснаваны на працы, на выкарыстанні працы’ (*працоўнае выхаванне, працоўная школа*), ‘зароблены, здабыты працай, атрыманы за працу’ (*працоўныя даходы,*

*працоўная слава*), ‘запоўнены, заняты працай’ (*працоўнае жыццё, працоўныя будні*). У другім значэнні ‘які жыве сваёй працай’ (*працоўны народ, працоўныя класы грамадства, працоўнае сялянства*) адзначана ўжыванне гэтага слова як назоўніка *працоўны* (-ага, *м.*) (*працоўныя Беларусі, працоўныя ўсіх кантынентаў*). Прыметнік *працоўны* ўваходзіць у склад такіх тэрміналагічных словазлучэнняў, як *працоўны дзень, працоўныя рэзервы* (Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 4. П–Р / [рэд. Г.Ф. Верштат, Г.М. Прышчэпчык]. Мінск : Гал. рэд. Беларус. Сав. Энцыкл., 1980. С. 387).

У правазнаўчай маўленчай дзейнасці прыметнік *працоўны* мае тэрміналагічны статус і выкарыстоўваецца ў свабодным, а таксама сінтаксічна звязаным значэнні. Так, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у арт. 69 рэалізуе другое яго значэнне ‘які жыве сваёй працай’: «Права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты належыць грамадскім аб’яднанням, працоўным калектывам і грамадзянам у адпаведнасці з законам».

У ч. 7 канстытуцыйнага арт. 13 лексема *працоўны* мае значэнне ‘які жыве з працы рук’ і выступае не прыметнікам, а субстантываваным назоўнікам: «Дзяржава гарантуе працоўным права прымаць удзел у кіраванні прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі з мэтай павышэння эфектыўнасці іх работы і паляпшэння сацыяльна-эканамічнага ўзроўню жыцця». Тое самае назіраем і ў арт. 43 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: «Працоўныя маюць права на адпачынак. Для тых, хто працуе па найму, гэта права забяспечваецца ўстанаўленнем рабочага тыдня, які не перавышае 40 гадзін, скарочанай працягласцю работы ў начны час, прадастаўленнем штогадовых аплатных водпускаў, дзён штотыднёвага адпачынку».

Дакладнае веданне лексічнага напаўнення слова засцерагае ад маўленчых памылак, выпрацоўвае навыкі пазбаўлення ад іх. У нашым выпадку дазваляе адрозніваць ўстойлівыя словазлучэнні тэрміналагічнага характару з кампанентам *працоўны* ад сінтаксічна свабодных словазлучэнняў з сінанімічным у адносінах да прыметніка *працоўны* прыметнікам *рабочы* (рабочы народ, рабочы чалавек, рабочая моладзь).

У сучасных умовах беларуска-рускага і руска-беларускага білінгвізму спасціжэнне сістэмных і нарматыўных паказчыкаў дапамагае развіваць прыродную здольнасць да фарміравання і пашырэння ядра прафесійна неабходнай лексікі.